
БРАСЛАЎШЧЫНА, ГЛЫБОЧЧЫНА, МЁРШЧЫНА, ПАСТАЎШЧЫНА, ШАРКОЎШЧЫНА

KRESY

- Не плач! Мы вернемся вясной
І ў поле выйдзем грамадой,
Сустрэнем новы ўсход зары...
Максім Танк

КРЭСЫ

Газета NGO's Заходняй Віцебшчыны №6(6), жнівень 2000 год.



ГЛЫБОЧЧЫНА

Жыві і помні

Урочышча Барок, што недалёка ад Глыбокага папоўнілася яшчэ адным памятным месцам, якое сведчыць аб страшэнных злачынствах гітлераўцаў у гады Другой сусветнай вайны. Каб ушанаваць памяць аб сваіх суайчынніках, расстраляных і замардаваных у гэтым лесе, саюз аховы помнікаў Польшчы на днях адкрыў гранітны манумент у форме крыжа з увекавечанымі імёнамі ахвяр тэрора. На мармуровых плітах выбіты прозвішчы і васьмі святароў, трое з якіх прызнаныя пакутнікамі блажэннымі. Год назад, знаходзячыся ў Варшаве папа Рымскі Ян Павел Другі да ліку святых прылічыў ксяндзоў М. Багаткевіча, В. Мацьковяка і С. Пыртака, служыўшых людзям і Богу ў суседніх касцёлах. Пасля арышту ў снежні 1942 года, маючы магчымасць выратавацца ад пабігелі, ўсе трое адмовіліся ад уцёкаў, паколькі фашысты за гэта маглі расстраляць сотні ніўчым не вінных глыбачан. Ва ўрачыста-травурных мерапрыемствах і імшы ў храме ўдзельнічалі надзвычайны і паўнамоцны пасол Польшчы ў Беларусі пан М.Машкевіч, біскуп Віцебскай дыяцэзіі В.Блін, кіраўніцтва раёна, шматлікія госці.

✔✔✔

У Глыбокім знаходзіцца адзіная пакуль на Беларусі школа званароў. Сёлета такую экзатычную спэцыяльнасьць у школе атрымалі васьмёра чалавек, двое зь якіх жанчыны. Адна манахіня прыехала ў Глыбокае аж з Тульскага манастыра, каб тут авалодаць мастацтвам званарства. Заняткі ў школе праводзяцца на працягу чатырох месяцаў і уключаюць ня толькі практыку, але і лекцыі сьвятароў, этнографаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў. Наступны курс пачне заняткі ў школе зь верасьня.



МЁРШЧЫНА

Калі 77-гадовы Сцяпан Антонавіч Крамок у сваёй вёсцы Цвеціна Мёрскага раёна расказвае землякам пра сваё дзяцінства, то мужчыны толькі нэрвова пакурваюць самакруткі. Хлапчуком працаваў ён падпаскам у пана Аранскага і зарабляў за сезон 100 злотых. Прыбытак вялікай сям'і з 9 душ, жыўшай пры панскім маёнтку, састаўляў толькі 900 злотых, за што можна было купіць 600 пудоў збожжа і шмат чаго іншага. Пан плаціў яшчэ за працу 200 пудоў жыта, даваў сям'і карову, кавалак зямлі, не прымушаў працаваць па выхадных і на рэлігійныя святы. Усё памянялася з прыходам саветаў у горшую старану. Заробкі людзей, загнаных сілай у калгас, знізіліся хутка ў раз дзесяць. Сяляне страцілі волю і часта, як рабы, ўвогуле працавалі задарма. На жаль, так цягнецца і да гэтай пары. У калгасах Мёршчыны працягваюць цягнуць калгасную лямку звыш 4 тысяч працаўнікоў, чый заробак у першым квартале ледзь перавысіў 14000 рублёў. Жыць па-людзку ў вёсцы ў нас не атрымоўваецца да канца жыцця.


ПАСТАЎШЧЫНА

15 ліпеня ў Паставах адбылося супольнае ўрачыстае паседжанне раённай арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны, Пастаўскага краязнаўчага таварыства, раённага аддзялення БАЖ прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, земляка Уладзіміра Дубоўкі. На ім было распаведзена пра жыццёвы і творчы шлях паэта, прачытаны яго некаторыя вершы. Затым мясцовыя паэты знаёмілі прысутных са сваімі новымі творамі. У гэты ж дзень, некаторыя з удзельнікаў імпрэзы пабывалі ў вёсцы Агароднікі – радзіме паэта, дзе знаходзіцца яго хата.

(працяг на 2-й стар.)

(працяг, пачатак на1-й стар.)

Адмыслова для юбілею быў надрукаваны артыкул пра радзіму паэта – вёску Агароднікі, сучаснае яе жыццё ў двух нумарах незалежнай газеты "Сумежжа".



"Юнацтва ў збаўленні" – 2000, пад такім назовам з 24 па 29 ліпеня на тэрыторыі Пастаўскага раёна, у вёсцы Шыркі каля возера Світа, на базе Біблейскага цэнтра "Збаўленне" прайшоў міжнародны маладзёжны хрысціянскі злёт.

На злёце адбываліся служэнні пастараў, захапляльныя семінары на актуальныя маладзёжныя тэмы, творчыя вечары з удзелам хрысціянскіх музычных груп і выканаўцаў, спартландыя, хуткасны заплыў і спартыўныя спаборніцтвы па футболу і валейболу.

✔✔✔

Пачалі працаваць прадстаўніцтвы Беларускага Хельсінскага камітэта ў Глыбокім, Паставах, Браславе, вёсцы Заазерцы Шаркоўшчынскага раёна.

Кантактныя тэлефоны: Глыбокае - 2-37-54, Галіна Сутула; Паставы - 2-27-58, Лідзія Ластоўская.

✔✔✔

Вельмі цікавым для аматараў краязнаўства атрымаўся чарговы двайны нумар дадатка "Краязнаўца Паазер'я" да газеты NGOs Заходняй Віцебшчыны "Крэсы", які пабачыў свет у ліпені. Тэма нумару : " Камяні і дрэвы" – помнікі прыроды, якія знаходзяцца на тэрыторыі Глыбоцкага, Браслаўскага, Мёрскага і Пастаўскага раёнаў.

Дарэчы, сябры гуртка "Нальшчаны"- вучні Лынтупскай і Палескай школ Пастаўскага раёна мяркуюць правесьці некалькі экспедыцый па выяўленні новых культавых камянёў і даставанне аднаго з "чортавых" камянёў, які лічыўся прапаўшым з зямных нетраў.



ШАРКОЎШЧЫНА

У музеі культуры і быта, што ў в. Германавічы, адкрылася выстава, прысвечаная вайне паміж бальшавікамі і палякамі 1919-1920 г. г. Вайна, аб якой мы практычна ня ведаем нічога. У той жа час на тэрыторыі нашай мясцовасці ішлі даволі жорсткія баі. І як сведчанне – шматлікія пахаванні польскіх жаўнераў 1919-20 гг. на тэрыторыі нашага рэгіёна. І тут варта дадаць яшчэ адзін цікавы факт. Нягледзячы на тое, што бальшавіцкая ўлада праіснавала нашмат больш за польскую, савецкіх воінскіх пахаванняў у нас практычна няма. Нават ушанаваць належным чынам тых, хто аддаў свае жыцці за гэтую ўладу і то не здолелі.

Адкрыццю выставы папярэднічала краязнаўчая канферэнцыя, якая адбылася 1 ліпеня. Канферэнцыю праводзілі музей культуры і быта сумесна з культурна-асветніцкім цэнтрам імя Язэпа Драздовіча пры фінансавай падтрымцы Саюза Палякаў на Беларусі. Быў зачытаны шэраг дакладаў, якія аналізавалі падзеі, як з боку польскіх, так і з боку савецкіх даследчыкаў. Таксама прыводзіліся ўспаміны сведкаў гэтых падзей : Пілсудскага, Тухачэўскага, Сяргеева, Гая.

Аналізуючы прачытаныя даклады быў зроблены вывад, што з боку савецкіх даследчыкаў падзеі гэтай вайны адлюстраваны павярхова. Непераможная Чырвоная Армія гнала ворагаў-палякаў на захад бяз усялякіх баёў, бяз усялякіх страт свайго саставу, бяз усялякага супраціву з боку палякаў. Польскія ж крыніцы сведчаць аб даволі жорсткіх баях, якія адбываліся на тэрыторыі нашай мясцовасці.

Вялейская трагедыя

ДАРОГА СЬМЕРЦІ: ВЯЛЕЙКА – БАРЫСАЎ – СІБІР

Дарогай сьмерці завецца дарога зь Менску на Ігумен (Чэрвень), пад якім бальшавіцкія карнікі расстралялі ў першыя дні нямецка-савецкай вайны вязьняў менскіх турмаў. Такая самая Дарога сьмерці пралягла зь Вялейкі на Барысаў. Вязьні ішлі пяць дзён з 24 да 28 чэрвеня, дарога засталася засьцеленая трупамі. Яны знайшлі свой спачын ля муроў вялейскай турмы, у вялейскіх, лагойскіх, барысаўскіх лясах. Сьмерць сеялі не нямецкія кулямёты, а расейскія наганы. Сярод вязьняў было шмат нашых землякоў, ураджэнцаў Пастаўшчыны, якая тады ўваходзіла ў склад Вялейскай вобласьці.

(Друкуецца паводле газеты "Наша Ніва" № 25(182) ад 19 чэрвеня 2000 года)

22 чэрвеня 1941г., у дзень пачатку нямецка-савецкай вайны, быў выдадзены загад пра эвакуацыю вязьняў зь беларускіх турмаў. Вязьні з Баранавічаў, Валожына, Ліды мусілі быць пераведзеныя ў Чыцінскую вобласьць, вязьні з Горадні – у Іркуцк, зь Берасьця – у Тамбоў і Курск. Вялейскія вязьні мусілі накіравацца ў Разань. Паколькі эвакуацыя зь Вялейкі не ўяўлялася магчымай (станцыю ў Маладэчне бамбардавалі нямецкія самалёты), было вырашана перакінуць арыштаваных у Барысаў, а адтуль ужо праз Воршу, Вязьму, Маскву вывезьці ў Разань.

Транспарту для перакідкі не было, а вязьняў было шмат, таму арыштаваныя мусілі прайсьці пехам 180 км да Барысава цягам пяці дзён. Дарога ішла праз Сосенку, Ілію, Плешчаніцы і далей да Барысава. У загадзе на эвакуацыю прыводзіцца лічба – 1023 вязьні, хоць польскія дасьледчыкі лічаць, што ў турме знаходзілася ад 1500 да 1800 чалавек. Вязьні вялейскай турмы ў сваіх успамінах ацэньваюць колькасьць эвакуяваных прыкладна ў 2000 асобаў.

Акцыя пачалася 24 чэрвеня ў другой палове дня. Спачатку ў камэры зайшлі вартаўнікі, якія зачыталі сьпісы хворых і няздольных да маршу, атрыманыя ад лекара. Тым, чыё імя было агучана, загадалі застацца ў камэрах, астатнім загадалі сабраць рэчы, пакінуць у камэрах сеньнікі ды іншыя цяжкія рэчы. Каля 16-й гадзіны вязьняў вывелі на турэмны двор. Тых, хто праходзіў па расстрэльным артыкуле, адвялі за турэмную браму і расстралялі. Як паказваюць успаміны, расстралялі каля 200 чалавек. Пра лёс расстраляных пад мурамі турмы паведаміў нам Васіль Місюля. Рэляцыю пра падзеі ў Вілейцы ён падаў у траўні 1954 года камітэту Амэрыканскага Кангрэсу пад старшынствам Керстана, што дасьледаваў камуністычныя злачынствы. Успаміны Васіля Місюлі, які ў тыя жудасныя часы працаваў бугальтарам у Вялейцы, можна прачытаць у зборніку дакумэнтаў "За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі", выдадзеным Беларускай Цэнтральнай Радай. Прывядзём толькі вытрымку зь іх.

"Іншы, яшчэ больш жудасны абраз бальшавіцкай апекі на беларускіх землях я бачыў пасьля таго, як бальшавікі ўцяклі зь Вялейкі перад наступаючымі нямецкімі войскамі. Калі ўсе ўпэўніліся, што наехаўшыя з Савецкай Расеі бальшавікі ўцяклі, а іх мясцовыя памоцнікі пахаваліся, то шмат народу захацела адведаць турму, зь якой уначы выгналі ўсіх арыштаваных невядома куды. У турме нашым вачом паказаліся абставіны, у якіх бальшавікі трымалі людзей і якіх нельга было забыцца да сьмерці. На ніжэйшым паверху камэры былі высака забалочаныя нечыстотамі, урынай, бруднай саломай. Вышэйшыя камэры былі пазаліваныя нечыстотамі з парашак. Смурод у будынку быў не да вытрыманьня.

На турэмным панадворку была пабудаваная невялікая зямлянка, зь якой ішоў акрываўлены сьлед па зямлі ад нечага цяжкага, валочанага ў бок сьвежа закопанай траншэі тут жа на гародзе. У зямлянцы мы пабачылі моцна апырсканую крывёю сьцяну, на якой было шмат дзюрак ад куль. На падлозе зь пяском быў аграмадны грыб згусьцелай крыві. Тут стралялі людзей, якіх пасьля цягнулі па зямлі ў траншэю.

На другі дзень створаная гарадзкая ўправа, пад кіраўніцтвам Л. Сапешкі, прыступіла да раскопак на турэмным панадворку. Я бачыў, як адкапалі адну самую сьвежую траншэю. Тут былі застрэленыя куляй у патыліцу людзі, са зьвязанымі назад калючым дротам рукамі, уложаныя адзін каля другога і прысыпаныя ня тоўстым слоем зямлі. Пласты людзей ляжалі адзін над другім, разьдзеленыя нятоўстымі слаямі зямлі. Пры мне адкапалі тры пласты яшчэ сьвежых трупаў. Шмат хто зь людзей мог распазнаць сваіх родных ці знаёмых па твары, а ў ніжэйшых пластох – па вопратцы. Далейшых раскопак я ня бачыў, бо на падворку турмы немагчыма было стаяць дзеля цяжкога паху ад адчыненых магіл. Пры мне было вырыта больш за сотню трупаў. Распазнаных забралі родныя з бліжэйшых вёсак і пахавалі на сваіх магілках. Рэшту ахвяраў перавезьлі на гарадзкі могільнік і пахавалі па хрысьціянскім абрадзе.

Агулам знойдзена ў вялейскіх траншэях каля 500 трупаў людзей, вымардаваных НКВД за паўтара года савецкай улады. Так было ў невялічкай Вялейцы, але ж такія парадкі былі пад саветамі па ўсёй шматпакутнай Беларусі".


Перад 22 чэрвеня вэрмахту з ініцыятывы шэфа Айнзацгрупы С было загадана захапіць вязьніцы і ўтрымліваць пад сваёй апекай вязьняў да перадачы іх сілам аховы. Нямецкая выведка працавала добра, і ў першыя дні вайны нямецкаму камандаваньню стала вядома пра эвакуацыю арыштаваных на ўсход. Літаральна адразу была праведзеная эксгумацыя, у якой бралі ўдзел

вайсковыя ўлады, новая адміністрацыя, мэдыкі, жыхары местаў, а ў некаторых выпадках замежныя журналісты.

Згодна зь нямецкімі справаздачамі і тагачаснай прэсай, колькасьць зьнішчаных каля муроў складае 500-800 чалавек.

Вернемся ж да астатніх вязьняў. Яны былі падзеленыя на дзьве раўназначныя групы. Асобна былі аддзеленыя ад гэтых дзьвюх групаў жанчыны, якія ішлі па-за асноўнымі калёнамі. Вялейскіх вязьняў надзейна ахоўваў конны канвой, ёсьць сьведчаньні, што ў суправаджэньні вязьняў брала ўдзел уся вялейская міліцыя, якая панічна ўцякала на ўсход.

Першыя расстрэлы былі праведзеныя адразу каля вёскі Касута, што недалёка ад Вялейкі, у якім кілямэтры ці меней ад цяперашняга берага Вялейскага вадасховішча. Апоўначы калёны арыштантаў дасягнулі вёскі Сосенка. Пры падыходзе да вёскі зноў гучалі стрэлы — мо нехта спрабаваў уцячы, пасьля чаго энкавэдысты паклалі вязьняў тварам на тракт. Першы адпачынак быў зроблены ў мястэчку Ілія, што прыкладна за 30 км на ўсход ад Вялейкі. Там вязьні атрымалі па кавалку хлеба, пяць кавалкаў цукру і вады ўволю. Адпачыўшы дзьве-тры гадзіны, вязьні рушылі далей.



Перад Плешчаніцамі калёну нагналі нямецкія самалёты, вязьням было загадана легчы на тракт, ахоўнікі пахаваліся ў равах і пачалі страляць па самалётах зь вінтовак, карабінаў, кулямётаў. На такую страляніну зьвярнулі ўвагу нямецкія лётчыкі, разьвярнулі машыны і ськінулі дзевяць бомбаў на канвой. Забітых сярод арыштантаў не было, але загінулі і былі параненыя некалькі канваіраў. Перапужаныя нямецкімі бомбамі, коні з вазамі паразьбягаліся. Гэта раззлавала карнікаў, і пачалася бойня. Вязьням было загадана кінуць свае пажыткі і бегчы да лесу — некалькі дзесяткаў мэтраў ад дарогі, бо ісьці гасьцінцам было небясьпечна. Там, у лесе, ахвяры беглі некалькі кілямэтраў безь перадыху. Тых, хто адставаў, расстрэльвалі зь вінтовак або, каб ашчадзіць патроны, забівалі штыхамі.

Вось што ўспамінаў удзельнік таго маршу Францішак Пілярскі:

"Людзі падалі ад зьнямогі. Тады іх калолі штыхамі два ці тры разы, і далей. Па астатніх стралялі бесьперапынна. Казік Ракоўскі дапамагаў свайму стрыечнаму брату, я яму дапамагаў. Да нас падбег адзін з энкэвэдыстаў і зароў:"Бросай его". Дулам рэвальвэра настаўляў то на мяне, то на Казіка. Мы кінулі стрыя Казіка. Энкавэдыст стрэліў з рэвальвэра двойчы ў галаву, і бедны Ракоўскі зарыўся носам у зямлю. Мы беглі далей. Страх сьмерці гнаў нас наперад".

Вязень Баляслаў Янцэвіч успамінаў:

"У часе адпачынку гімназіст Часлаў Сівіцкі выразіў нязгоду у адрас канвою з нагоды забойстваў палякаў. Яго адразу расстралялі на вачах у іншых вязьняў. Па гадзінным перапынку зноў сказалі ўстаць і маршаваць далей. Калі ўсе ўсталі, сын Маршанскага (настаўніка зь Сьвянцянаў), ідучы з бацькам, хацеў яму дапамагчы, гэта заўважыў энкэвэдыст, падбег да Маршанскага і загадаў адпусьціць бацьку, сын не паслухаўся, зараз жа энкэвэдыст стрэліў Маршанскаму ў галаву, забіўшы на месцы, сына ж ударыў".

Канвой загадаў сьцішыць бег толькі пад самымі Плешчаніцамі. У тым шалёным бегу загінула шмат вязьняў. Доктар Вялічка (Тадэвуш Дыбоўскі), удзельнік таго маршу, у кнізе Рышарда Шаўлоўскага "Польска- савецкая вайна 1939 г.)" ацэньвае колькасьць забітых у дарозе — 108 чалавек. У "Рэгіянальнай газэце, друкаваліся прозьвішчы тых, хто быў забіты на Дарозе Сьмерці зь Вялейкі ў Барысаў і каго запомнілі доктар Вялічка з таварышамі.

Але гэта быў яшчэ не канец. Пад Барысавам на мосьце церазь Бярэзіну за пару кілямэтраў ад гораду кінуўся ў ваду Юзаф Ярашэвіч, што справакавала новы расстрэл тых, хто ішоў побач зь ім.

28 чэрвеня калёны дайшлі да Барысава. На ўскрайку гораду слабейшых вязьняў пасадзілі на аўтамабілі і завезьлі на станцыю. Там вязьняў пасадзілі ў таварныя вагоны, замкнулі дзьверы. Пачаўся налёт. Канваіры разьбегліся хаваціа. Цягнік зь вязьнямі знаходзіўся паміж вайсковымі цягнікамі, таму замкнёныя арыштанты патрапілі ў самы эпіцэнтар абстрэлу зь нямецкіх самалётаў. Праз Воршу, Вязьму, Маскву вязьняў даставілі ў Разань. Замест 322-х вязьняў, паводле дакумэнтацыі НКВД, у Разанскую турму прыбылі толькі 322 справы на іх. Гэта значыць, што ў дарозе загінулі яшчэ 322 чалавекі.

Для жывых пачынаўся новы этап іхных пакутаў.

АЛЕГ ГАРДЗІЕНКА.

Самы балючы мой успамін

РАГНЕДА АЛЯХНОВІЧ

У Вялейскай турме ў 1940г. быў зьняволены мой бацька, а ў 1944-45 г. — маці. Абое былі сьведамымі бела-

русамі, жылі й працавалі дзеля Бацькаўшчыны. Такога бальшавікі не прабачылі.

Мой бацька Вінцук Грышкевіч (на эміграцыі Вінцэнт Жук-Грышкевіч) быў арыштаваны ў вільні восеняй 1939 г. Вязьніца х Вялейцы – толькі частка яго турэмнай Галгофы. Бо прайшоў ён Лукішкі ў Вільні, турмы ў Беластоку, Менску, Полацку ды Воршы, «трудовые» лягеры на Пячоры. А потым – армія Андэрса, удзел у бітве пры Монтэ-Касіна (Італія), доўгія гады эміграцыі, стварэньне беларускіх асяродкаў у Вялікабрытаніі й Канадзе, праца на радыё "Вызваленьне", блізу 12 гадоў на пасадзе Старшыні Рады БНР. Памёр ён у 1989 г., пражыў 86 гадоў.

А маці пражыла няпоўныя 40 гадоў. Жыцьцё яе, як мне перадалі празь дзесятак гадоў, абарвалася ў Вялейскай турме. Пра яе – мой самы балючы ўспамін.

Маю маму Ксеню Грышкевіч, з дому Лапіцкую, арыштавалі ў канцы жніўня 1944г. было мне тады 13 гадоў. І стала я насіць маме ў Вялейскую турму перадачы, як тады казалі – 2падаянкі". Пад час наступу савецкіх войскаў турма гарэла. Таму вязьняў трымалі ў шэрым аднапавярховым будынку з маленькімі закратаванымі вокнамі, які быў побач. Людзі зь перадачамі станавіліся ў чаргу каля агароджы й чакалі, пакуль падыдзе дзяжурны энкэвэдыст і возьме запіскі ды торбачкі з прадуктамі і бялізнай. Дзяжурнымі былі тутэйшыя вясковыя хлопцы, якія вярнуліся з партызанаў. У чарзе найбольш былі сяляне – у хустках, сьвітках, а калі захаладала – у кажушках, чуйках. валёнках.

Аднойчы, стоячы ля агароджы, я пабачыў маму. Яна ішла ў сваім сінім зімовым паліто, але зь непакрытай галавой, косы складзены "кошычкам", рукі за сьпіной. Яе вялі два энкэвэдысты. Праходзячы каля мяне, яна ціха сказала:"Ня плач. Ідзі дамоў. Я скора вярнуся".

Позьняй восеняй міма таго ж плоту правялі майго стрыечнага дзядзьку Кастуся Касяка. Я скамянела ад нечаканасьці. жаху й зьдзіўленьня : быў ён у чырвонаармейскім шынялі й пілётцы і гаварыў па-расейску: "Так это и есть Вилейка?". Мусіць такім чынам хацеў мне паказаць, каб я яго не прызнавала. Дзядзьку Кастуся прысудзілі да сьмерці цераз павешаньне. Прысуд выканалі ў Вялейцы. Маму я бачыла яшчэ адзін раз на пачатку зімы. Арыштаваных ужо трымалі ў будынку турмы. Каб пабачыць блізкага чалавека, калі ён знаходзіўся ў адной з камэраў на другім паверсе, трэ было перайсьці на процілеглы бок вуліцы й паглядзець уверх, на вокны вязьніцы. Я так і зрабіла. Праз колькі часу я пабачыла маму. Яна ўзьнімала ў руках клуначак, які я перадала. Потым адклала яго, згарнула рукі так, нібы мяне абнімала. Але турэмныя вокны закрылі шчытамі, і нават такой уцехі я больш ня мела.

У лютым мае перадачы сталі вяртаць са словамі: " Выбыла в этап". Пэўны час я ўсё яшчэ хадзіла да турмы. А потым стала чакаць вестачак ад мамы. Не дачакалася. Пасьля сьмерці Сталіна, недзе ў канцы 50-х, мне перадалі, што ў Вялейскай турме, калі там была зьняволеная мая мама, усчалася эпідэмія тыфу. Яна захварэла і памерла. Але ці так гэта насамрэч было – ня ведаю.

ДАРАЖЭНЬКІ БАЦЬКА СТАЛІН!

Даражэнькі Бацька Сталін! Я дзяўчынка 10-гадовая Ірэна Аляксандраўна Гапанёнак. Я хаджу ў 3-ю клясу. Сёньня 8 лістапада 1940 г. – вялікае сьвята, якое прынесла для ўсяго савецкага народа нечуванае шчасьце. Сёньня ў нашай школе а 10-й раніцы была імпрэза для дзяцей. І я там дэкламавала вершык: "Слава!" І калі распавядала, глядзела на твой партрэт і гучна мовіла: "Леніну слава! Сталіну славу!" І бачыла я, як усе заўсьміхаліся зь вялікай радасьцю, гледзячы на твой партрэт. Вярнуўшыся дахаты, узяла паперу і пёра, і , працягваючы да твайго партрэту сваю маленькую руку, прашу цябе, не адмаўляй мне ў вялікай просьбе, вярні мне майго татулечку, Аляксандра Францавіча Гапанёнка, які быў арыштаваны 15 верасня 1940 г. Арыштавала яго мясцовая міліцыя Вялейскай вобласьці, Дунілавіцкага раёну, вёскі Глінішчы. Родны бацька Сталін, калі нас выслалі зь Вялейскай вобласьці і мы ехалі ў цягніку, я ўвесь час пяяла песьні твае, сталінскія, польскія фашысты мяне абзывалі маленькую за гэта, мацюкалі, і абзывалі мяне за гэта камуністкай. Але гэтае слова было для мяне вялікай славай. І гэта слова засталося вялікай радасьцю. Родны бацька Сталін. Дні і гадзіны буду ад цябе чакаць адказу. Я, маленькая піянерка, пяю твае песьні і з гэтай вясёлай усьмешкай дачакаюся твайго ліста, зь якім буду ісьці правільнай дарогай да свайго татулечкі Аляксандра Францавіча Гапанёнка, аддам твой ліст яму ў рукі... Родны бацька Сталін, прашу моцна, аддай нам нашага татачку. Чакаю як хутчэйшага адказу, сэрца маё падскоквае ад радасьці, што бацька Сталін дасьць адказ, я буду перакананая, твая Сталіна дачка, Іра Аляксандраўна Гапанёнак, мне 10 год.

Мой адрас: Паўладарская вобласьць, Бескарагайскі раён, сяло Семіянск.

Пасьляслоўе

Пасьля прыходу саветаў у верасьні 1939 г. адразу пачаліся арышты. Як сведчыць кніга Натальлі Івановай і Уладзіміра Адамушкі пра рэпрэсаваных у Вялейскай вобласьці "Зьлітуйцеся", паводле якой цытуецца гэты ліст, у Пастаўскім павеце была раскрытая контррэвалюцыйная арганізацыя (ОЗОН) у складзе 14 чалавек. Сярод сяброў арганізацыі быў і Аляксандар Гапанёнак. Чым займалася, згодна з судовым заключэньнем, гэтая група?

1. Праводзіла актыўную прапаганду і агітацыю, накіраваную на ўмацаваньне ў былой Польшчы нацыянал-фашызму.
2. Пад час выбараў ў былы парлямэнт і мясцовыя органы ўлады ў 1938 г., дэлегатамі былі абраныя тыя, якія былі пажаданыя кіраўнічым колам Польшчы і кіраўнікам арганізацыі.
3. Вяла актыўную антысавецкую прапаганду і паклёп на СССР.
4. Умацоўвала каталіцкі касьцёл і праводзіла апалячваньне нацыянальных меншасьцяў...

Большасьць сяброў арганізацыі, сярод іх і бацька дзяўчынкі Аляксандар Гапанёнак, атрымалі па восем

гадоў лягераў, іхныя сем'і выслалі ў Казахстан, там - апынулася і дачка Аляксандра Гапанёнка Ірэна. Гэтая маленькая дзяўчынка шчыра верыла, што бацьку можна вярнуць...

А. Г.

ВЯЛЕЙСКАЯ ТУРМА

Згодна з дамовамі Молатава-Рыбэнтропа пра падзел Польшчы паміж Савецкім Саюзам і Нямеччынай, 17 верасьня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі пераступілі савецка-польскую мяжу і пачалі "вызваляць" заходнебеларускія землі.

Ужо праз тры тыдні літоўцам аддалі Вільню. Распачалі калектывізацыю зямлі, праўда, пакуль не такую маштабную, як у 1949 г. Напаўняліся турмы, куды садзілі тых, хто лічыўся сацыяльна небясьпечным для камуністаў. Пачаліся арышты заможных сялянаў, паноў, асаднікаў, чыноўнікаў, службоўцаў, інтэлігенцыі.

Савецкія турмы ў Заходняй Беларусі былі ў Баранавічах, Валожыне, Лідзе, Нясьвіжы, Навагрудку, Слоніме, Стоўпцах, Беластоку, Маладэчне, Горадні, Ваўкавыску, Ломжы, Берасьці, Кобрыні, Пружанах, Ашмяне, Глыбокім, Пінску, Драгічыне, Століне, Вялейцы. Згодна



з савецкімі дакумэнтамі, у турмах Заходняй Беларусі ўтрымлівалася на чэрвень 1941 г. ня меней за 16357 чалавек (менавіта столькі вязьняў належала эвакуяваць ува ўсходнія рэгіёны Савецкага Саюзу, але ж былі яшчэ й тыя, каго належала расстраляць на месцы). Паколькі сьледзтва звычайна доўжылася пару месяцаў, а пасьля зьняволенага або расстрэльвалі, або вывозілі ў глыбіню Расеі ці Казахстану, можна ўявіць, колькі людзей прайшло праз заходнебеларускія турмы ў 1939-41 гадах.

Вялейка раскінулася на берагох Вяльлі ў 100 км на паўночны захад ад Менску. За польскімі часамі была цэнтрам павету ў складзе Віленскага ваяводзтва. Тут дзейнічалі суполкі Сялянска-Работніцкай Грамады, Таварыства Беларускай Школы, КПЗБ. У 30-я гады ў горадзе налічвалася 7,5 тыс. жыхароў. Адной са славутасьцяў места была турма, пабудаваная некалі, адразу па далучэньні Вялейкі да Расейскай імперыі. За палякамі турма была лімітаваная, г.зн., што ў ёй не павінна было ўтрымлівацца больш за 350 чалавек.

Пасьля прыходу саветаў вялейская турма пачала выконваць новыя функцыі. Цяпер у яе кідалі тых, хто ўяўляў небяспеку для новых гаспадароў. Першыя тры месяцы вялейскі астрог быў павятовай турмою, калі ж пасьля прыняцьця Заходняй Беларусі ў склад БССР 4 сьнежня была ўтвораная Вялейская вобласьць, вязніца пачала выконваць функцыі абласной турмы. Як вынікае з савецкіх афіцыйных дакумэнтаў, на 10 чэрвеня 1941 г. у вялейскай турме налічвалася каля 1023 вязьняў, г. зн. у тры разы больш за польскі ліміт. У турму звозілі вязьняў з усяе Вялейскай вобласьці – з Маладэчанскага, Смургоньскага, Ашмянскага, Радашкавіцкага, Пастаўскага, Докшыцкага, Глыбоцкага, Мядзельскага, Дзісенскага, Браслаўскага, Друйскага раёнаў. Пры гэтым працавалі й раённыя турмы. Так, у чэрвені 1941г. з Маладэчанскай турмы мусілі быць эвакуяваныя 575 чалавек, з Глыбокага (Беразьвечча) – 678, з Ашмяны – 265 чалавек. Трэба падкрэсліць слова "эвакуяваныя", бо значную колькасьць вязьняў, "найбольш небясьпечных для савецкай улады", меркавалася расстраляць на месцы. Для параўнаньня, у Беластоку ў чэрвені 1941 г. утрымлівалася мінімум 2126 чалавек, у Берасьці – 3850 чалавек, у Горадні – 1796 чалавек. Лёсы вязьняў Горадні, Берасьця (у тым ліку й Берасьцейскай крэпасьці), Беластоку, Ашмяны, Пінску яшчэ чакаюць дасьледаваньня.

Зьвернемся таксама да кнігі Натальлі Івановай і Ўладзіміра Адамушкі "Зьлітуйцеся", напісанай на матар'ялах, што датычаць Вялейскай турмы. У кнізе прыводзіцца дакладная запіска на імя намесьніка пракурора БССР па спэцыяльных справах "*Аб працы спэцыяльнага аддзелу Вялейскай вобласьці Пракуратуры за 1940 год*". Працытуем гэты дакумэнт:

"За справаздачны пэрыяд працы прайшло сьледчых справаў па стане на 1 студзеня 1941 г. 4705 справаў, з колькасьцю асобаў 5051 чалавек, скончана 4376 зь іх; накіравана па падсуднасьці на разгляд Асобай Нарады НКВД СССР 4255 справаў, у Абласны суд 17, у Вайсковы Трыбунал 3 справы, спынена папярэднім сьледзтвам 101 справа.

Асуджана 3035 чалавек, вернута афіцыйна на дасьледаваньне Асобай Нарадай НКВД СССР з канкрэтнай спасылкай 35 справаў. Спынена на стадыі папярэдняга сьледзтва, пачынаючы з 17 верасьня 1939 году па 1/1 1941 году па лініі УНКВД, уключаючы і 101 справу на 346 чалавек.

Тэрміны разбораў справаў:

Да 1 месяца – 672 справы

Ад 1 да 2 месяцаў – 848 справаў

Звыш 2 месяцаў – 2856.

Па артыкулах Крымінальнага Кодэксу БССР справы разьмеркаваныя наступным чынам:

па арт. 74 КК БССР – 1888,
па арт.70 КК БССР – 14,
па арт.120 КК БССР – 1710,
па арт. 64 КК БССР – 452,
па арт. 72 КК БССР – 275,
па арт. 75 КК БССР – 17,
па арт. 71 КК БССР – 3,
па арт. 63 КК БССР – 62,
па арт. 118 КК БССР – 12,
па арт. 145 КК БССР – 22".

Кажучы пра размах рэпрэсіяў, нельга не згадаць і тых людзей, якіх проста арыштоўвалі і без заключэньня ў турму накіроўвалі ў Сібір і Казахстан. Менавіта так зрабілі і з жонкай польскага афіцэра Франца Кушаля Натальляй Арсеньевай, якая на той час працавала ў вялейскай "Сялянскай праўдзе": "...Аднае прыгожае раніцы, калі я толькі ўставала з ложку, каб ісьці зноў у рэдакцыю пасьля недаспанае ночы, у нашыя дзьверы пастукалі ўзброеныя энкэвэдыстыя. Яны зь мейсца абшукалі мяне, дарма што я была без сукенкі, і загадалі мне зараз жа зьбіраецца з хлапцамі, куды не сказалі... Пасьля перагляду рэчы і пасьцель абы-як зьвязалі ў клумак, і неўзабаве мы ўжо стаялі ў машыне, якая імчала вуліцамі Вялейкі. Шмат такіх машынаў можна было пабачыць у гэты сьцюдзёны золкі дзень 13-га красавіка ў горадзе! Усіх высланых звозілі на станцыю й ладавалі ў даўжэзны таваровы цягнік. Уся станцыя была поўная людзей. Вартаўнікі грубыя, брутальныя; сплаканыя, напалоханыя жанчыны (іх ды дзяцей было 99%); сваякі й знаёмыя, якія, дарма што бальшавіцкія запалохваньні, прыбеглі праводзіць сваіх блізкіх у далёкую нязнаную дарогу, усё гэта мітусілася, пхалася, крычэла й плакала. Энкавэдоўцы шчыльна абкружылі цягнік, але ўсё-той і гэты з натоўпу прарываўся, падбягаў да дзьвярэй вагонаў, падаваў тую ці іншую забытую рэч, бутэльку малака, яшчэ раз развітваўся. Нас – ніхто не праводзіў, хоць мы і ехалі ў вялікую дарогу, ня маючы пры сабе нават кавалка хлеба. Ды ці да хлеба тады было?

Такіх дэпартаваных з Заходняй Беларусі было, паводле зьвестак беларускага гісторыка Хацкевіча, каля 120 тысячаў (10 лютага 1940 г. за адну раніцу з усіх куткоў Заходняй Беларусі было вывезена 50 тысячаў чалавек, 13 красавіка – 24 тыс., 29 чэрвеня – 23 тыс., 19 чэрвеня 1941 г. – 22 тыс.). Гэта – без уліку жаўнераў Войска Польскага, што апынуліся ў савецкіс палоне, а тады – пад Катыньню, у Асташкаве, у Сібіры. Наступная дэпартацыя – "кулакоў", багатых вясковых гаспадароў – была заплянаваная на 20-я дні чэрвеня, але яе сарвала вайна.

Абвінавачваньні для вязьняў турмы былі збольшага надуманыя. Многа людзей арыштоўвалі за пераход дзяржаўнай мяжы – савецка-літоўскай ці савецка-нямецкай. Савецка-літоўская была надуманай мяжой. У выніку прыхамаці Сталіна Вільню з краем перадалі Літве, і край аказаўся падзеленым напалам, сваякі, што жылі ў суседніх вёсках, аказаліся па розныя бакі мяжы. Яшчэ больш трагічнай была сытуацыя з новай савецка-нямецкай мяжой. Некалькі дзесяткаў тысяч жаўнераў Войска Польскага ці апынуліся ў нямецкім палоне, ці прабіваліся з акружэньня. Тыя, каму пашчасьціла зьбегчы з палону ці мінуць нямецкія блёк-пасты, вярталіся на Бацькаўшчыну, у тым ліку і Вялейшчыну. Але тут іх чакала жорсткае расчараваньне, усе яны былі арыштаваныя саветчыкамі і абвінавачаныя ў шпіянажы на карысьць замежных выведак.

Бараноўскую Гертруду, жыхарку вёскі Пенцялі Ашмянскага раёну, арыштавалі за тое, што яна "ведала пра існаваньне паўстанцкай арганізацыі, што існавала на тэрыторыі Ашмянскага раёну і ставіла задачы зьвяржэньня ўзброеным шляхам савецкай улады і ўзнаўленьня польскай дзяржаўнасьці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, і не паведаміла пра гэта".

Арыштаваных у турме катавалі. Зьвернемся да ўспамінаў Эдварда Колпака: "У тым часе ўсе павыходзілі з пакою, застаўся толькі я і мой сьледчы Кацо. У цэлым будынку панавала суцэльная ціша, бо была ўжо глыбокая ноч. Кацо адчыніў шуфляду бюро і выняў пісталет і гумовую палку. Дула пісталета скіраваў на мяне і зароў: "Калі не падпішаш, то заб'ю цябе як сабаку" – але я паўторна адказваю, што ніякай паперы не падпішу, можна мяне нават забіць. Зараз раззлаваны Кацо падскочыў да мяне і пачаў страшна зьбіваць палкай, пакуль не стаміўся, потым ударыў мяне ў патыліцу так, што я зваліўся ніц, а ён далей біў мяне ляжачага ботамі, біў па жываце, твары, усім целе, біў так, што зламаў насавую перагародку, потым усеўся на мяне і біў палкай, урэшце калі я згубіў прытомнасьць, ён вывалак мяне да прыбіральні, што знаходзілася насупраць па левы бок калідора, там абліў мяне халоднай вадой, я апрытомнеў. Калі я расплюшчыў вочы, дык пабачыў, што ляжу ў прыбіральні, а Кацо палівае мяне вадой. Потым Кацо дапамог мне ўстаць і правёў мяне да свайго кабінэту, загадаў мне сядаць у тое самае крэсла і зноў пачаў мучыць мяне, каб я падпісаў той няшчасны пратакол, на што я адказваў, што я не падпішу, і што ён можа мяне забіць, але я не падпішу. Раззлаваўшыся на маю станоўчую адповедзь, падбег да мяне і пачаў біць гумовай палкай па галаве, твары, а найчасьцей па нагах, вышэй каленяў.."

Эдвард Колпак не адзінкавы, такіх былі сотні ў Вялейскай турме. Толькі што, у адрозьненьне ад іншых, ён выжыў і пасьля занатаваў свае ўспаміны, якія пазьней былі выдадзеныя кнігай.

Здавалася, нішто ня спыніць сталінскую мясарубку. Але спыніла вайна.

Алег Раявец.

"Усе гэтыя зьвесткі прыводзяцца паводле кнігі Кшыштафа Папіньскага, Аляксандра Какурына і Аляксандра Гур'янава "Дарога сьмерці. Эвакуацыя савецкіх вязьніцаў з Крэсаў Усходніх II Рэчы Паспалітай у чэрвені й ліпені 1941 году" (на польскай мове). Варшава.Karta, 1995.

Шаноўныя чытачы! З гэтага нумара мы пачынаем Вас знаёміць з кнігамі пра наш край, якія выйшлі апошнія гады ў Польшчы. Презентацыю пачнем з трыпціху Хенрыка Паяка, дзве першыя кнігі якога, расказваюць пра Віленшчызну міжваенных год (Шаркоўшчына, Паставы, Мосар, Глыбокае).







Część pierwsza - „**Tam, za snem**" (1991) to głośna powieść o Wileńszczyźnie lat międzywojnnych. Tygiel narodowości, języków, tradycji i obyczajów. Zapadłe zaścianki szlacheckie nieistniejącego już świata. Zastygły czas, w który brutalnie wdziera się historia naznaczona piętnem bolszewizmu i hitleryzmu.

"Z Polski wszelakiej droga do Wilna wiedzie zawsze na wschód. Jest wszakże kraina, jeden z najdalszych skrawków dawnej niepodległej, z której ku Ostrobramskiej patrząc pod słońce zachodu, plecy mają wydane na Azję.

To Szarkowszczyzna, powiat Postawy. W niej wsie Mosarz i Jałozur, piętnaście kilometrów od miasteczka Głębokie. Albo Hłubokoje. Albo Jełazur, jak kto woli.

- Więc ty bacz, gdzie żyjesz. Kogo masz za plecami!

Tak przestrzegał, tak nauczał i przekazywał Teofil Ruszkiewicz każdej z czterech kolejno dorastających córek, na koniec swemu jakże późnemu jedynakowi.

Szczególnie mocno wyrzekł te słowa owego pamiętnego dnia, w którym uznał, że czas już przekazać dziedzicowi nazwiska tamten rodowy papier, dokumenty szlachectwa tych wszystkich, co idą z rodu Ruszkiewiczów. Na razie nie tyle przekazać, co jedynie wskazać chłopakowi tę skrytkę, w której przechowywał ów klejnot rodu, to czujnie strzeżone miejsce, co pewien czas zmieniane zresztą na coraz to inne, zda się pewniejsze od poprzedniego.

Ten papier, ten klejnot: kruchy zrudziały rulon sygnowany wewnątrz starodawną pieczęcią grodzką, upstrzony gotyckimi zawijasami, z serca szlacheckiej polskości dobyty i tak utrwalony.

Sam zaś, choć posłuszny podobnym nakazom swego dawno już nieżyjącego ojca Wiktora, pan Teofil niezbyt akuratnie dochował wierności swym korzeniom. Ich czystości, szlacheckiej linii, choć przecie nie inaczej jak jego ojciec i dziad, a może jeszcze dobitniej niż oni rozumiał, że żadne nieszczęście, najniższy próg ubóstwa, schłopienie najokropniejsze nie równa się czemuś tak strasznemu, jak postradanie rodowego dokumentu...

...I oto nastaje ta krótka, parna, wodnista noc. Trwa nad nimi poza biegiem czasu i miałkością ludzkich spraw, pachnąca wilgocią przybrzeżnych trzcin i gnijących traw, brzemienna głębią szarych fal. Ukośnie omiata twarze, z trudem dobywa je z mroku i ponowie w nim gubi. Łódka porusza się w rytmie drąga, sama wciąż jakby uśpiona na powierzchni wody i mętnych spraw tego świata. Wszystkowiedząca twarz dziadka Ignaca pełna zmiennych cieni i blasków, niekiedy zwraca się ku chłopcu bez zbędnych słów...

I takim, w tej roli, w tym rozedrganym świetle pozostał na zawsze. Takim go zapamiętał Adamcio, Adaś, takim pozostał we wspomnieniach Adama. Ta twarz, ta postać starego boga wód. Nigdy i nigdzie tak majestatyczna nie wydała mu się nawet twarz ojca. Nigdy nie znalazł w niej tego królewskiego spokoju, tego zbratania z żywiołem, tej pewności siebie. I tego pojednania z własnym losem, w pełnej z nim zgodzie i harmonii. Przeżycia zbliżonego do tej sceny, choć nie tak przejmująco pierwotnego, doznał rok później przy nocnym ognisku, po polowaniu w nadleśnictwie Miory. We dwóch z ojcem: pośrodku głuszy równie miękkiej i płynnej jak tamta, nieodgadnionej jak wody tamtego jeziora...

WOLNY, to druga część tryptyku, historycznymi korzeniami osadzona na Wileńszczyźnie i Zamojszczyźnie.

WOLNY, to kontynuacja. Czas obrzękły cierpieniami, groźbą zagłady nie tylko fizycznej lecz także wszystkiego co ludzkie, a zwłaszcza chrześcijańskie. Czy bohater oprze się pokusom moralnego i duchowego wydziedziczenia, będąc już wydziedziczonym z własnego domu, rodziny, ukochanej Wileńszczyzny i Polski?

KRESY
КРЭСЫ
Газета NGO Заходняй Віцебшчыны
Рэдактар Міхал Гіль
Тэл.факс.:2 17 84; E-mailgil@postavy.belpak.vitebsk.by
Меркаванні рэдакцыі і аўтара могуць не супадаць. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць і падбор матэрыялаў.
Наклад 299 паасобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакументацыі
Аддрукавана на абсталяванні ГА «Усяслаў Чарадзей» г.Наваполацк